ДУК “Мазырская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Сектар краязнаўства

аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ ім. А.С. Пушкіна

# Старонкі гісторыі Мазыршчыны



## Каляндар памятных дат і падзей на 2020 год

http://gallery.mozyrlib.by/

# Каляндар памятных дат і падзей на 2020 год

## Агульныя даты

**865 гадоў** з часу (1155) першага ўпамінання Мазыра ў летапісах, калі князь кіеўскі Юрый Далгарукі перадаў горад свайму саюзніку чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу.

**405 гадоў** з часу (1615) антыфеадальнага выступлення гараджан Мазыра.

**260 гадоў** з часу (1760) узвядзення будынка кафедральнага сабора ў імя святога архангела Міхаіла ў Мазыры, помніка архітэктуры барока.

**125 гадоў** з дня нараджэння **Брэгмана Аляксандра Абрамавіча** (1895, г. Мазыр - 1919), рэвалюцыйнага дзеяча. Узяты ў палон польскімі войскамі і пакараны смерцю.

**90 гадоў** з часу (1930) заснавання сельскагаспадарчага прадпрыемства **“Козенкі-агра”** ў Мазырскім раёне як калгаса імя Варашылава. З 2010г. - КСУП з сучаснай назвай. Адміністрацыйны цэнтр знаходзіцца ў аграгарадку Козенкі, на тэрыторыі гаспадаркі - 3 населеныя пункты. Спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі.

**90 гадоў** з часу (1930) заснавання сельскагаспадарчага прадпрыемства **“Слабадское імя Леніна”** ў Мазырскім раёне. З 2007 года - СВК, з 2010 - КСУП. Адміністрацыйны цэнтр знаходзіцца ў аграгарадку Слабада, на тэрыторыі гаспадаркі - 12 населеных пунктаў. Спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса, раслінаводства.

**70 гадоў** з часу заснавання (1950) **Мазырскага машынабудаўнічага завода** ў г. Мазыр як рамонтна-экскаватарнага завода. У верасні 1953 года выпушчана першая прадукцыя. У 1958 г. перайменаваны ў завод меліяратыўных машын. З 2000 года - ААТ. З 2004 г. - у складзе ААТ “Мінскі трактарны завод”.

**45 гадоў** з часу увядзення ( 1975) ў эксплуатацыю першай устаноўкі па перапрацоўцы нафты **Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода**. Будаўніцтва пачалося ў 1971 г. у Мазыры. З 1994 г. - ААТ. З 2013 г. уся прадукцыя адпавядае стандарту Еўра -5.

**45 гадоў** з часу заснавання (1975) сельскагаспадарчага прадпрыемства **“Прыпяць”** у Мазырскім раёне. З 2012 г. з сучаснай назвай у падпарадкаванні ААТ “Гомельскі тлушчавы камбінат” . Адміністрацыйны цэнтр знаходзіцца ў в. Козенкі. Спецыялізуецца на перапрацоўцы насення алейных раслін (рапса).

http://gallery.mozyrlib.by/

**40 гадоў** з часу адкрыцця (1980) у Мазыры **сярэдняй школы № 11.**

**30 гадоў** з часу заснавання (1990) **Мазырскага драматычнага тэатра імя І. Мележа.** Створаны на базе Мазырскага народнага тэатра гарадскога Дома культуры і называўся Беларускі эксперыментальны тэатр "Верасень". З 1994 г. - сучасная назва. Заснавальнік і першы кіраўнік М. Колас. Тэатр - лаўрэат і ўдзельнік Міжнародных тэатральных фестываляў "Кантакт" (Польшча, 1994), "Надзея" (г. Гродна, 2001), "Славянскія тэатральныя сустрэчы" ( г.Бранск, Расія, 1995, 2003; г. Гомель, 2002, 2004, 2008, 2011), імя Марыі Занькавецкай (г. Нежын, Украіна, 2012) і інш.

**30 гадоў** з часу адкрыцця (1990) **Палаца культуры ААТ "Мазырскі НПЗ".** Агульная плошча 9028,6 кв.м. Працуе 36 клубных фарміраванняў (у т. л. 13 дзіцячых), з іх 7 калектываў са званнем "народны", 2 - са званнем "заслужаны", 2 - са званнем "узорны".

## Студзень

7 **- 80** гадоў з дня нараджэння **Гусака Мікалая Адамавіча** (н. 7.01.1940, в. Іванкаўшчына), беларускага вучонага ў галіне оптыкі і фізікі паўправаднікоў. Доктар фізіка-матэматычных навук (1988).

## Люты

16 - **95** гадоў з дня нараджэння **Мельцера Давыда Барысавіча** (н. 16.02.1925, г. Мазыр), беларускага гісторыка-славіста. Доктар гістарычных навук (1975). Прафесар (1977). З 1992 г. жыве ў ЗША.

## Сакавік

2 - **115** гадоў з дня нараджэння **Некрашэвіча Ільі Рыгоравіча** (2.03.1905, г.Мазыр - 18.11.1993), беларускага фізіка, аднаго з заснавальнікаў навуковай школы па фізіцы плазмы. Прафесар (1960). Заслужаны дзеяч навук Беларусі (1972).

5 **- 100** гадоў з дня нараджэння **Рыжкова Антона Андрэевіча** (5.03.1920 - 28.01.1944), Героя Савецкага Саюза (1944), удзельніка вызвалення Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у баі падчас Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі. Яго імем названа вуліца ў Мазыры, дзе ён пахаваны ў брацкай магіле на Кургане Славы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Чырвонай Зоркі, медалём "За адвагу".

http://gallery.mozyrlib.by/

**31** - **110** гадоў з дня нараджэння **Бібіка Фёдара Цярэнцьевіча** (31.03.1910, в. Майская - 2.05.1945), поўнага кавалера ордэна Славы.

## Красавік

**2** - **90** гадоў з дня нараджэння **Гусака Сяргея Адамавіча** (2.04.1930, в. Іванкаўшчына - 20.12.1969), літаратуразнаўца, крытыка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1969).

**19** - **65** гадоў з дня нараджэння **Сідоркіна Валерыя Барысавіча** (н. 19.04.1955, в. Галавачы Буда-Кашалёўскага раёна), беларускага мастака. Член Саюза мастакоў Беларусі, СССР (1985). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік шматлікіх мастацкіх выстаў і пленэраў. Яго карціны знаходзяцца ў музеях і карцінных галерэях Мінска, Гомеля, Магілёва, Светлагорска, Калінкавічаў і інш. Жыве ў Мазыры з 1980г.

## Май

**120** гадоў з дня нараджэння **Дзікана Ігната Максімавіча** (май, 1900, в. Раеўскія - 13.02.1948), аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Гомельскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Генерал-маёр (1943).

**1** - **85** гадоў з дня нараджэння **Шлягі Мікалая Іванавіча** (1.05.1935, в. Перадрэйка - 25.06.2004), савецкага ваеннага дзеяча. Генерал-палкоўнік (1990). Яго імем названа вуліца ў Калінкавічах. Аб ім зняты дакументальны фільм "Генерал из Полесья».

**16** - **75** гадоў з дня нараджэння **Анісімава Валерыя Іванавіча** (н. 15.05.45 - красавік, 2011), беларускага вучонага ў галіне педагагічных навук. Доктар педагагічных навук (2001). З 1981г. працаваў ў Мазырскім педагагічным універсітэце імя Шамякіна І.П.

**22** - **80** гадоў з дня нараджэння **Крука Леаніда Парфір'евіча** (22.05.1940, в. Скрыгалаў - 17.01.1982), акцёра.

**31** - **105** гадоў з дня нараджэння **Няжнова Валянціна Сцяпанавіча** (31.05.1915 - 24.01.1944), Героя Савецкага Саюза (1944). Загінуў у баі падчас Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі. Пахаваны на Кургане Славы ў Мазыры, дзе ў яго гонар названа вуліца.

http://gallery.mozyrlib.by/

## Чэрвень

7 - **55** гадоў з дня нараджэння **Пясецкага Аляксандра Сяргеевіча** (н. 7.06.1965, г. Мазыр), беларускага мастака.

## Ліпень

20 - **115** гадоў з дня нараджэння **Ціханава Ільі Панцялеевіча** (20.07.1905 - студзень, 1944), удзельніка вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Загінуў пры вызваленні Мазыра. Яго імем названа вуліца ў г. Мазыры.

## Жнівень

5 **- 75** гадоў з дня нараджэння **Талкачова Яўгенія Аркадзьевіча** (н. 5.08.1945, г.Мазыр), беларускага фізіка-тэарэтыка. Доктар фізіка-матэматычных навук (1990). Прафесар (2000).

18 - **45** гадоў з дня нараджэння **Гардынскай Наталлі Мікалаеўны** (н. 18.08.1975, г. Мазыр), беларускай спартсменкі і трэнера (шакатан каратэ-до, каратэ WKF). Майстар спорту Беларусі (1997).

## Верасень

15 - **85** гадоў з дня нараджэння **Коласа Міхаіла Яўхімавіча** (н. 15.09.1935, в. Картынічы Лельчыцкага раёна - ), беларускага акцёра, рэжысёра. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1972). Працаваў у Мазырскім драматычным тэатры імя І. Мележа.

19 **- 65** гадоў з дня нараджэння **Багірава Алега Мамедавіча** (н.19.09.1955 в. Прудок), беларускага спартсмена (пажарна-выратавальны спорт). Майстар спорту СССР (1980). Майстар спорту СССР міжнароднага класа (1990).

http://gallery.mozyrlib.by/

## Кастрычнік

13 - **115** гадоў з дня нараджэння (1905-1986) **Ветрава Івана Дзмітрыевіча**, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў падпольнага і партызанскага руху на тэрыторыі Палескай вобласці, ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (1974).

19 - **70** гадоў з дня нараджэння **Васкоўскага Міхаіла Васільевіча** (19.10.1950 - красавік, 2012), беларускага народнага майстра-кераміста. Член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці (1992). Народны майстар Рэспублікі Беларусь (2005). Удзельнік мастацкіх выстаў з 1975г.

## Лістапад

14 – **110** гадоў з дня нараджэння **Вікенцьева Казіміра Францавіча** (14.11.1910, г. Мазыр - 1995), ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (1994). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Вялікай Айчыннай вайны I ступені, Аляксандра Неўскага, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга і інш.

23 - **115** гадоў з дня нараджэння **Ярмолінай Ларысы Аляксандраўны**(23.11.1900, г. Мазыр - 20.02.1984), беларускай актрысы, тэатральнага дзеяча. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1949).

## Снежань

24 - **35** гадоў з дня нараджэння **Рабчанкі Дзмітрыя Аляксандравіча** (н. 24.12.1985, г.Мазыр), беларускага спартсмена (веславанне на байдарках і каноэ). Заслужаны майстар спорту Беларусі (2008). Пяцікратны чэмпіён свету на каноэ-чацвёрцы (2006, 2009, 2010, 2011).Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету на каноэ-чацвёрцы (500 м - 2005, 200 м - 2006). 4-кратны чэмпіён Еўропы на каноэ-чацвёрцы (200 м - 2006, 1000 м - 2007, 2008, 2012).

25 - **40** гадоў з дня нараджэння **Петрушэнкі Рамана Іванавіча** (н. 25.12.1980, г. Калінкавічы), беларускага спартсмена (веславанне на байдарках і каноэ). Майстар спорту Беларусі міжнароднага класа (2001). Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Бронзавы прызёр XXVIII (2004, Афіны, Грэцыя, байдарка-двойка) і чэмпіён (байдарка-чацвёрка на дыстанцыі 1000 м) і бронзавы прызёр (байдарка-двойка на

http://gallery.mozyrlib.by/

дыстанцыі 500 м) XXIX (2008, Пекін, Кітай) Алімпійскіх Гульняў. Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (2002, Севілья, Іспанія, байдарка-чацвёрка на дыстанцыі 500 м). Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (2001, Мілан, Італія, байдарка-чацвёрка на дыстанцыі 500 і 1000 м). Пераможца этапаў Кубкаў свету на байдарцы-чацвёрцы (2001 - двухкратны, 2002 - трохкратны). Чэмпіён свету (2005, 2007, 2008). Узнагароджаны ордэнамі Айчыны II і III ступеняў, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені. З 2004 г. - выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П.Шамякіна. Лепшы спартсмен года Беларусі (2009). Ганаровы грамадзянін Калінкавіцкага раёна (2009).



http://gallery.mozyrlib.by/



















http://gallery.mozyrlib.by

**Складальнік і камп'ютарны набор: Цюленева Н.В.**